Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ НІВА

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 — 6. (Wilenska 12. m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзен. Адміністр. ад 9 да 3

Падпіска на адзін месяц з дастаукай да хаты 2 зл. Для заграніцы удвая даражэй.

Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

№. 16 (29). Вільня, Чацьвер, 25-га лютага 1926 г. Год II.

Цэнтральная Беларуская Школьная Рада гэтым даводзіць да ведама ўсяго беларускага грамадзянства, што ад 25 га гэтага лютага да 25-га сакавіка г. г. Радаю ладзіцца:

ТАННАЯ ПРАДАЖА БЕЛАРУСК. ЛЕМАНТАРА І ПЕРШАЙ КНІЖКІ ПАСЬЛЯ ЛЕМАНТАРА.

(з уступкаю напалавіну).

Лемантар **„Зорка“** I ч. каштуе 35 грошаў. Першая кніжка пасьля лемантара **„Зорка“** II ч. каштуе 42 грошы. Хто выпіша разам дзьве кніжкі, атрымае бясплатна „Беларускі насьценны каляндар“, які ў асобнай прадажы каштуе 50 грошаў. На перасылку аднэй кніжкі простай пасылкай да вартасьці кнігі трэба дадаць 8 грошаў, а заказной 45 грошаў. На перасылку дзьвёх кніжак простай пачкай дадаць 15 грошы, а заказною таксама 45 грош.

За кнігі і за перасылку можна прысылаць паштовымі маркамі. Кніжкі высылаюцца толькі па атрыманьні ўсей іх вартасьці і за перасылку.

Заказы адрэсоўваць: **У Цэнтральную Беларускую Школьную Раду, Вільня, Віленская 12.**

Да беларускага грамадзянства.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Сусьветная вайна дашчэнту зруйнавала шматпакутны наш край. Змагаючыся за сваё істнаваньне, жывучы ў цёмных і сырых зямлянках і акопах, яшчэ пад грукат гарматаў нашы гаротныя земляробы дбалі і аб найдаражэйшым сваім скарбе — **сваіх дзетках, аб іх узгадаваньні і навуцы.** Не спадзяючыся на пераходныя акупацыйныя ўлады, беларускія земляробы сталі саматугам адчыняць свае родныя беларускія школы. За кароткі час у Навагрудчыне, Віленшчыне і Горадзеншчыне паўсталі сотні беларускіх школак.

У халодных не апаленых будынках душа беларускіх дзетак саграваласяя навукай у зразумелай ім сваей роднай беларускай мове. Нашы паўгалодныя вучыцялі з ахвярнасьцю спаўнялі настаўніцкія абавязкі прад сваім маладым пакаленьнем.

Але ня доўга давялося красавацца гэтым школам. Пасьля Рыжскага міру ўлада пазачыняла беларускія школы, а на месца іх паадчыняла польскія. Вучыцялі засталіся бяз працы, дзеці пад прымусам і пагрозаю бацьком штрафамі сілком заганаюцца ў польскія школы, дзе навука выкладаецца ў незразумелай для беларускіх дзетак польскай мове.

Ня гледзячы на сотні прыгавораў беларускіх грамадзян на прыватныя беларускія школы, на дзесяткі тысяч складзеных дэклярацыяў на беларускую ўрадовую школу, улада ня рупіцца даць ні той ні другой. А час праходзіць, дзеці растуць у цемры, дзічэюць, застаюцца без узгадаваўчага нагляду.

Дбаючы аб узгадаваньні беларускай моладзі і наагул аб асьвеце беларускага народу, **Таварыства Беларускай Школы ў Вільні** ладзіць танную прадажу **„Беларускага лемантара“ і „Першай кнігі пасьля лемантара“**, каб у цяжкіх сучасных варунках памагчы агульнай бядзе, каб беларускія дзеткі дома, пад кіраўніцтвам пісьменных бацькоў, братоў ці сёстраў ці наагул пісьменных грамадзян у вёсцы навучыліся пабеларуску чытаць і пісаць.

За невялікія грошы кожны бацька ці матка павінны выпісаць для сваіх дзетак **„Беларускі лемантар Зорку I ч.“ або „Першую кніжку, Зорку II ч.“**, каб даць карысныя і прыемныя заняткі сваім нічога ня робячым дзеткам.

Кожны пісьменны грамадзянін у вёсцы павінен споўніць свой грамадзкі абавязак і памагчы няпісьменным бацьком удома навучыць чытаць і пісаць іх дзетак.

Найбольш у гэтым могуць і павінны дапамагчы беспрацоўныя настаўнікі.

Усе на змаганьне з цемраю, каб агульнымі высілкамі даць хоць крыху сьвету нашым няшчасным дзеткам.

Цэнтр. Белар. Шк. Рада,
Вільня, 18./II. 1926 г.

Нумар 15 (28) „Беларускае Нівы“ з 24 лютага сканфіскаваны камісарам ураду на места Вільню за стацьці: „Залаты мост“ і „Шпіёнская афэра“ ў Верхняй Сілезіі.

Насьпеўшая патрэба.

За апошнія два гады Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні наладзіў дужа важную і патрэбную працу. Гэта—арганізацыя ад часу да часу публічных лекцыяў з розных галін беларусазнаўства, з якімі ані наша інтэлігенцыя без спэцыяльных досьледаў, ані студэнцкая моладзь у польскім унівэрсытэце пазнаёміцца ня мае магчымасьці. Праўда, колькі гадоў назад віленскі унівэрсытэт зрабіў быў спробу завясьці выклад беларускае мовы, але за выкладчыка быў назначаны чалавек („прафэсар“ Масоніўс), які ня меў ніякага паняцьця аб прадмеце і навет ня ведаў аб капітальных досьледах па беларускай філялёгіі акадэміка Карскага, паклаўшых мураваны фундамант пад далейшую працу ў гэтай галіне навукі.... Дык уканцы і сам унівэрсытэт, відаць, зразумеў усю бязмэтнасьць выкладаў пана Масоніўса, але—замест замяніць яго запраўды адпаведнай сілай—зусім выкінуў з унівэрсытэцкае праграмы выклад мовы насяленьня тае краіны, у цэнтры якое знаходзіцца ўнівэрсытэт!

Лекцыі, ладжаныя студэнцкім Саюзам, па свайму характару заўсёды пастаўлены на належнай вышыні і запраўняюць патроху тую нястачу, якую наша студэнцкая моладзь так балюча адчувае ў галіне пазнаньня свайго народу і краю. Сярод тэм гэных лекцыяў пераважалі літэратурныя, пасьля ішлі гістарычныя, ўрэшце — эканамічная. А сталы ўзрост слухачоў, якія што-раз гусьцей і гусьцей запаўнялі салю лекцыяў, ды той гарачы і шчыры прыём, які з іх боку спатыкалі кожын раз лектары, найлепш паказваюць патрэбу і карыснасьць акцыі Студэнцкага Саюзу.

Гледзячы на гэта, сама сабой прыходзе думка аб тым, каб гэты добры пачын нашае моладзі больш энэргічна і чынна падтрымала нашае старэйшае грамадзянства і тыя нашыя культурныя ўстановы, простай *павіннасьцяй* якіх павінна быць гэткая праца. Трэба было-б наладзіць справу так, каб лекцыі вяліся *сыстэматычна, паводле наперад распрацаванага пляну*, які абняў-бы галоўныя галіны беларусазнаўства. Трэба нам у Вільні закласьці нешта кшталтам *Беларускага Народнага Унівэрсытэту*.

Тут гожа прыпомніць, што з такой думкай віленскія беларусы насіліся яшчэ ў часох нямецкае акупацыі — у 1916 годзе. Тады да арганізацыі народнага ўнівэрсытэту былі прыступілі палякі і жыды, і вось, узьнялася думка, каб усе гэтыя паасобныя высілкі розных нацыянальнасьцяў аб'яднаць, прыдбаць супольнае для ўсіх выгоднае памяшчэньне і неабходныя прылады. Але думка гэтая разьбілася — як заўсёды бывала і ў іншых справах!—аб нацыяналізм польскае групы, хаця ў апошняй былі і паны польскія сацыялісты... Палякі гатовы былі пайсьці на аб'яднаньне, але толькі чыста фармальнае: яны проста баяліся беларуска-літоўскіх уплываў на „сваіх“ слухачоў, — баяліся, каб тыя не пачулі праўды аб беларускім і літоўскім народах ад прадстаўнікоў гэтых народаў!..

Цяпер, калі асьвятленьне ўсіх пытаньняў аб жыцьці і мінуўшчыне нашага краю і народу даецца нашай моладзі ў польскім унівэрсытэце выключна ў такім духу, які карысны польскай урадавай палітыцы,—патрэба беларускага народнага ўнівэрсытэту, ці хацябы проста *курсаў беларусазнаўства* ў Вільні зьяўляецца асабліва вострай і неадкладнай. Гэта—адна з найпільнейшых спраў, зрэалізаваць якую трэба не адкладаючы: бо-ж і слухачоў, і лектароў у нас хопе!..

Ці будзе Польшча у Радзе Лігі?

Прэсавая кампанія.

Толькі два тыдні асталіся да 8 сакавіка, калі Агульны Збор Лігі Народаў мае вырашыць справу, каму зараз-жа, а каму мо' пасьля (а мо' і ніколі!) дастануцца сталыя мейсцы ў Радзе Лігі. Дык, ясна, што гэты кароткі час будзе выкарыстаны ўсімі заінтэрэсаванымі дзяржавамі дзеля самай гарачай, адчайнай барацьбы.

І прэса ўсяго сьвету пачала гэтую кампанію, выяўляючы волю сваіх краёў і ў значнай меры прадбачачы рэзультаты паседжаньня 8 сакавіка.

Англійская прэса наагул, як сьцвярджае сам „ПАТ“, — няпрыхільна да павялічэньня Рады новымі сябрамі, апрача Нямеччыны.

Цікава фармулуе пагляд англійскай публічнай апініі ведамы францускі публіцыст Бэнвіль (манархіст і „прыяцель Польшчы“, уздыхаючы толькі за... узнаўленьне франка расейскага саюзу!). Ён піша, што англійскія палітыкі сьмяюцца з прэтэнсіяў Польшчы быць вялікай дзяржавай... „Лёкарнскі дух“,—піша ён,—трэбуе, каб на карысьць Нямеччыны былі мірна зьменены яе ўсходнія граніцы, праведзеныя залішне лёгкамысна... А Польшча, хоча ці ня хоча, павінна падчыніцца гэтаму..,

Швэцкая прэса ўся ў адзін голас трэбуе цяпер пусьціць у Раду толькі Нямеччыну, дый наагул—проці ўсякай далейшай зьмены ў Радзе.

Орган швэцкіх сацыял-дэмакратаў, матывуючы варожую пазыцыю Швэцыі да польскіх дамаганьняў, піша, што „мейсца ў Радзе ня можна даць тым дзяржавам, якія створаны коштам іншых дзяржаваў (народаў), бо іх уплыў на працу Лігі будзе найбольш шкодным.

Чэха-славацкая прэса вельмі дэлікатна піша аб кандыдатуры Польшчы... на **нясталае** мейсца ў Радзе, дадаючы, што выбар Польшчы стаўся-б коштам Чэха-Славакіі, якая прадстаўляе ў Радзе ўсю Малую Антанту (як Швэцыя—ўсе Скандынаўскія дзяржавы: сябе, Нарвэгію, Данію і Фінляндыю)...

Чэха-славацкая прэса зьвяртае ўвагу на пагрозы польскае прэсы, што ў выпадку адмовы ей сталага мейсца ў Радзе Лігі, яна... адвернецца ад Заходу і павернецца тварам да Усходу...Ці не даўно пара?!

Урэшце **нямецкая** прэса, не разводзячы зашмат піша, што ўсялякая зьмена ў складзе Рады, не прадбачаная ў Лёкарно, зьмяняе ў аснове ўсю ўстанову Лігі, дык дае і Нямеччыне права пераглядзець нанова яе рашэньне аб уваходзе ў Лігу... І быццам нямецкі ўрад ужо ў гэткім духу афіцыяльна заявіў англійскаму ўраду... „Гатоўцеся тады ў уласным саку, а Нямеччына ня ўвойдзе ў Лігу“ (дадатак да голасу Чэхіі).

„Каталіцкі блёк“.

Францускаяя радыкальная прэса — ў клапоце! Яна хацела-б умацаваць уплывы Францыі ў Радзе Лігі, пусьціўшы туды Польшчу, але за ей трэба было-б пусьціць і Гішпанію і Бразылію. А тут папская сталіца на вестку аб гэтым зараж-жа загаманіла аб стварэньні ў Радзе Лігі... можнага „каталіцкага блёку“, зложанага з Італіі, Гішпаніі, Бразыліі і Польшчы... У гэты клерыкальны блёк не ўвайшла-б „бязбожная Францыя“, у якой радыкальныя ўрады даўно вядуць заўзятую барацьбу з засільлем каталіцкага кліру... Гэткім чынам падтрымаць кандыдатуру Польшчы—для радыкальнага ўраду Брыяна падвойна забойча і немагчыма: і з боку міжнародавай і з боку ўнутранай палітыкі...

Калі верыць галасам англійскай прэсы, Брыян так умовіўся з Чэмбэрленам: Францыя, спаўняючы „шляхотна“ сваё абяцаньне саюзнай Польшчы, рашуча падтрымае яе кандыдатуру ў Раду... Але ўсе іншыя ўплывовыя дзяржавы—сябры Рады і Лігі папросту пяройдуць да чарговых спраў над прапазіцыяй Францыі... Гэткім чынам будзе ўратавана

шляхотная ляяльнасьць саюзьніцы, і скандалу з „каталіцкім блёкам“ (—проціфранцускім і проціанглійскім!)—ня будзе...

Чым Францыя хоча заплаціць Нямеччыне за польскую кандыдатуру ў Раду Лігі?

Адна англійская газэта паведамляе, што Францыя гатова заплаціць Нямеччыне за згоду на польскае мейсца у Радзе Лігі — далейшым значным зьмяншэньнем ваеннай акупацыі Надрэніі...

А вось другая французская газэта піша, што французскі ўрад маніцца запрапанаваць Нямеччыне за яе згоду—польскі Гданскі Калідор...

Гэткая думка—вельмі дасьціпная: бо і тань ней для Франпы, і ведама, што Нямеччына ўваходзіць у Лігу, каб першым чынам узяць назад гэты Гданскі Калідор...

Францыя і Японія аб дамаганьнях Польшчы.

Лёнданская „Трыбуна“ даведалася, што паразуменьне Францыі з Англіяй у справе польскай кандыдатуры ў Раду Лігі ўжо дасягнута... Але—не Чэмбэрлен уступіў Брыяну, а наадварот—Брыян Чэмбэрлену...

Тая ж газэта піша, што Японія рашуча выказалася проці ўваходу ў склад Рады Лігі новых сяброў, апрача Нямеччыны.

Хто скарыстаў са спадку злотага?

Польскія паны заўсёды лаюць банкавых ці біржавых жыдоў-спэкулянтаў за тое, што быццам яны, ну, калі не выклікаюць, дык пэўна-ж паглыбляюць спадак польскай валюты, зарабляючы на гэтым значныя сумы... Але пабачым, хто-ж, апрача іх, яшчэ скарыстаў з гэтага спадку?

Як ведама, польскі злоты „заламаўся“ і два разы спадаў—якраз у той час, калі, пасьля жніва, пачалася так-званая экспортная кампанія, ці папросту — **вываз збожа за-граніцу**. Ведама і тое, што сялянства ў Польшчы наагул настолькі малазямельнае дый згалелае, што ня прымае амаль ніякага ўчасьця ў гэтай вывазной кампаніі. Яе вядуць выключна **вялікія зямляўласьнікі.**

Цяпер возьмем некалькі вельмі прыблізных лічбаў, каб даць паняцьце аб тых зысках, якія мелі абшарнікі-экспортэры ў зьвязку з спадкам польскай валюты.

Ведама, што за праданае заграніцу збожа абшарнікі атрымліваюць заплату ў далярах. Дык, напрыклад, у сьнежві за квінтал жыта на граніцы плацілі, пры курсе даляра ў 10 злотых, — па 33 злотых. У той самы час на галоўных унутраных рынках, дзе рахавалі на злотыя, цана на жыта была каля 24 злот. Што-ж датычыць глухіх бездарожных кутоў краю, дзе драбнейшы гаспадар ці згалелы селянін павінны былі прадаваць можа апошняе збожа, каб толькі заплаціць падаткі, дык там за тую ж меру не плацілі навет і паловы заграннічнай цаны...

Цяпер пабачым, каму польскі ўрад дапамог у гэткім цяжкім палажэньні, створаным яго-ж фінансавай і гаспадарчай палітыкай, выклікаўшай спадак валюты. Польскі ўрад, зложаны з прадстаўнікоў буйных абшарнікаў, гандляроў і капіталістаў, дапамог толькі і выключна — буйным экспортэрам—абшарніцкім і гандлёвым арганізацыям, зьнізіўшы ў часе вывазной кампаніі як мага тарыфы (плату) за правоз збожа з краю да граніцы...

Гэткім чынам абшарнікі і скупшчыкі скарысталі **патройна**: на спадку злотага, на таннай цане збожа ў дробнага зямляроба ў краю і — на зьніжанай плаце за правоз. Дык, падлічыўшы ўсе зыскі разам—на тую вялізарную масу вывезеннага з краю збожа, якая ўжо на траціну перавысіла дазволеную разумнай і чэснай дзяржаўнай гаспадаркай норму, узяўшы ад унутранага спажыўца штось каля паловы патрэбнага яму для свайго выжывеньня да новага жніва збожа,—падлічыўшы ўсё гэта, мы зразумеем, для каго працуюць на ральлі хлебаробы, для каго расьце збожа, для каго існуе польскі ўрад, **для каго ўрэшце — спадае польская валюта...** Усё гэта робіцца для спэкулюючай на народнай бядзе хэўры абшарнікаў і злучанай з імі хэўры гандляроў-экспортэраў, якія маюць сваіх прадстаўнікоў у польскім урадзе... А калі так, дык можна пайсьці мо' й яшчэ на крок далей: калі ў патрэбны час так выгадны і карысны пэўным клясам спадак валюты (а спадак гэты пэўна-ж можна, маючы ўладу над фінансава-валютным апаратам, выклікаць умысна!), дык зусім ня так недарэчным будзе дапушчэньне, што ў справе спадку польскага злотага ў патрэбны для польскіх экспортэраў час вывазной кампаніі — да гаспадарчай няздарнасьці польскіх фінансістаў далучылася ўладна пакіраваўшая ім **злая воля польскіх абшарнікаў і буйных хлебных гандляроў**, якая працуе плянова, сьведама, маючы перад усім на ўвеце толькі і выключна свой асабісты кішанёвы інтэрас...

Што гэтая абшарніцкая воля губіць сваю дзяржаву, у гэтым, здаецца, ужо ніхто не сумляваецца!

Важнейшыя здарэньні.

У Польшчы.

Сэнсацыйны напад літоўскіх войск на польскую тэрыторыю.

Віленскія газэты пішуць:

19 лютага ў паўдзён цэлы атрад літоўскага войска, азброенага стрэльбамі і кулямётамі, перайшоў граніцу ў раёне Падгаяў і, прагнаўшы польскі атрад, заняў Падгайскі лес, пасунуўшыся аж на 1 кілямэтар у глыб тэрыторыі Польшчы (павет Віленска-Троцкі). Пасьля гэтага літоўскі атрад, навязаўшы лучнасьць з сваёй граніцай, пачаў умацоўвацца ў заваяваным мейсцы...

Далейшыя весткі падаюць, што падгайскі набег мае характар пляновай і паважнай ваеннай апэрацыі... Бо—ў м. Кернове былі пакінуты рэзэрвы ў сіле 2 атрадаў рэгулярнай пяхоты і значнай лічбы шаўлізаў, на чала з радам вышэйшых афіцэраў літоўскай арміі... „Дзен. Віл.“ навет „сам бачыў“ паміж імі і 2 нямецкіх афіцэраў! Места Кернаў выглядае, як ваенны лагер („Дзен. Віл“). Усе ўстановы яго занялі ваенныя ўлады... Навакол уведзены ваенны стан... Забаронены ўсялякі рух насяленьня, уначы забаронена паліць агонь... Над занятым лесам лётаюць літоўскія лятуны...

У апошні мамэнт газэты падалі, што польская пагранічная паліцыя выкінула літвіноў з занятага імі лесу, пры чым узяла ў палон 8 літоўскіх пагранічнікаў. Гэтак палюбоўна зьліквідаваць канфлікт не ўдалося, і на граніцы была густая страляніна. З польскага боку страты ў людзях ня было.

Ізноў спаў злоты...

У апошнія дні ізноў раптам спаў злоты. 19 лютага ў Варшаве плацілі ўжо аж 8.30 за доляр. Цяпер ізноў злоты трохі падняўся, але затрымаўся на 7.80—7.90 за доляр.

Беспасярэднім повадам раптоўнага спадку злотага было некаторае ажыўленьне ў апошнія дні ў Лодзкай прамысловасьці, быццам атрымаўшай заказы з Усходу. Прамыслоўцы зьвярнуліся за добрай валютай у Польскі Банк, але той абмежаваў разьмен злотых на валюту, што і выклікала спадак злотага...

„Ксёндз-забойца“.

„Robotnik“ зьмяшчае карэспандэнцыю з падваршаўскай вёскі аб мясцовым ксяндзу Назарэвічу, які ў сваім „душпастэрстве“ дайшоў да таго, што пачаў—страляць у сялян...

Гэты ксёндз даўно ўжо выклікаў ненавісьць у сваіх парафіян, якіх заўсёды з амбоны лаяў бандытамі, а за тое шчыра падслужываўся суседняму абшарніку. Кс. Назарэвіч меў „неканонічны нахіл да жаноцкага полу“... Дык якраз на гэтым груньце і здарыўся замах ксяндза на селяніна, які амаль не каштаваў таму жыцьця... Калі ксёндз стаяў каля местэчковага рэстарану, акружаны маладымі паненкамі, дык адзін лясны работнік выходзячы з рэстарану, з абурэньнем голасна назваў кзяндза, кажучы да таварыша, „божым бугаём“.... Пачуўшы гэта, ксёндз тут-ж выхапіў з кішані рэвальвэр (які, відаць, насіў замест крыжа!) і стрэліў у работніка.—Куля, трапіўшы ў руку, надоўга пазбавіла яго працаздольнасьці...

„А крывавы ксенжулек,—канчае „Robotnik“,—далей абвяшчае слова Божае“....

Заграніцай.

Вялікія манэўры на радава-румынскай граніцы.

4 красавіка пачнуцца ізноў вялікія манэўры радавай арміі на румынскай граніцы. У манэўрах прыме ўчасьце кавалерыйскі корпус Будзеннага, армейскі корпус Тухачэўскага, 250 аэрапляпаў, артылерыя украінскіх акругоў і ўласная армія Малдаўскай Рэспублікі—у ліку 10.000 байцоў.

Манэўры будуць мець заданьнем — адбіцьцё атакі з боку Румыніі...

Да забойства радавых кур'ераў.

Літоўскія газэты пішуць, быццам замах на радавых кур'ераў быў арганізаваны Польшчай, каб выклікаць канфлікт між ССРР і Латвіяй.

Спорка аб мейсца канфэрэнцыі ў справе разбраеньня.

Не згадзіўшыся на Жэневу, дзе забіты быў радавы пасол Вароўскі, урад ССРР запрапанаваў Лізе, як мейсца міжнародавай канфэрэнцыі ў справе разбраеньня, Копэнгаген (сталіца Даніі).

Замест адказу.

(*Гістарычная спраўка*).

Новы орган так-званых „казённых беларусаў“—„Беларускае Слова“—у № 2 зьмясьціў чыста бандыцкі выпад проці мяне. Выпад гэны па сваей форме варт толькі таго, каб кіраўніка „газэты“ пацягнуць пад суд. Аднак, пакараньне адказнага „рэдактара“ мяне здаволіць ня можа, бо-ж вінаваты ня ён, а тыя „высокія асобы“, якія яго нанялі за мізэрную пэнсію.—Дык ні ў якую палеміку з „Бел. Словам“ я ўваходзіць ня буду, таксама і на лаянкі і зьвягу ўвагі не зварачаю. Затое пастараюся высьвятліць перад **чэснай** часткай нашага і **польскага** грамадзянства адну справу, якую ў сваім часе з яўна злой воляй паднялі паны Студніцкі з Обстам і якую цяпер з такой жа злой воляй і таксама фальшыва асьвятляе польскі поў-афіцыёз у беларускай мове.

Я хачу адтварыць адзін мамэнт з нядаўных часоў—з пачатку нямецкае акупацыі ў Заходняй Беларусі. Лішне многа ёсьць яшчэ сьведкаў з таго часу, якія могуць падцьвярдзіць тое, што апішу, а найлепшы сьведка—пісаныя дакумэнты, перахаваныя ў архіве Беларускага Музэю і даступныя кожнаму чалавеку добрае волі, які хацеў-бы з імі пазнаёміцца.

Падыходжу да гэтае справы так паважна, паміж іншым, і затым, што, у часе маей бытнасьці ў Парыжу падчас міравое канфэрэнцыі, на якой я выступаў у абароне інтарэсаў маей Бацькаўшчыны, я сустрэўся з адгалоскамі справы, да якой прыступаю, сярод учасьнікаў канфэрэнцыі—прадстаўнікоў вялікіх дзяржаў, якіх у адпаведным духу стараліся настроіць проці беларусаў польскія палітычныя агенты.

Яшчэ ў канцы 1915 году, калі немцы занялі Вільню, у так-званым Віленска-Ковенскім Абывательскім Камітэце адбыўся сход журналістаў усіх чатырох краёвых нацыянальнасьцяў, які пастанавіў ад імя ўсіх гэтых нацыянальнасьцяў зьвярнуцца да Обэр-Ост (галоўнага камандаваньня на Усходзе) з мэморыялам, дамагаючыся дазволу на выпуск газэт у краёвых мовах. Да мэморыялу былі далучаны просьбы аб канцэсіі на газэты ад кожнай нацыянальнасьці асобна, у тым ліку і ад беларусаў. Мне самому, як сябру прэзыдыуму Камітэту, давялося аддаць акупанцкім уладам мэморыял з усімі прылажэньнямі.—Аднак, вынікі гэтага першага згоднага выступленьня перад акупантамі ўсіх нацыянальнасьцяў краю аказаліся вельмі сумнымі: немцы, нездаволеныя праявай такой **салідарнасьці**, далі на ўсё просьбы аб канцэсіі на газэты адмоўны адказ.

Але акупанты разумелі, што без газэт край жыць ня можа, дык пастанавілі пайсьці насустрэчу дамаганьням мэморыялу, але шляхам перагавораў з кожнай нацыянальнасьцяй асобна. І вось **першую** канцэсію на газэту атрымалі.... **палякі!**

Праз нейкі час пачаліся перагаворы з беларусамі і літвінамі. Гэтым дзьвюм групам немцы паставілі вельмі цяжкія варункі канцэсіі. Баючыся, што праз газэту можа ўстанавіцца цесная сувязь паміж віленскімі радыкальнымі беларускім і літоўскім цэнтрамі і сялянскімі масамі, немцы паставілі такі варунак: канцэсія будзе дадзена, але з тым, што адміністрацыя газэты астанецца ў руках Прэсавае Управы („Pressestelle“). Такім парадкам беларуская група, якой будзе дадзена канцэсія, можа пісаць ўсё, што захоча (— ведама, што прапусьце нямецкая цэнзура!), а на пашырэньне газэт на правінцыі меціме манаполію Прэсавая Управа так, **каб рэдакцыя ня мела навет адрасоў сваіх падпішчыкаў!** Мала таго: дзеля забясьпечаньня аплаты адміністрацыі (нямецкай!) друкарні і паперы (якая йшла толькі з Нямеччыны), у канцэсіі быў устаўлены гэтакі пункт:

„§ 14. Die Pressestelle wird bemüht sein, das erforderliche Papier für die Zeitung zu besorgen. Die Kosten hierfür werden durch sich ergebende Überschüsse aus der Zeitung gedeckt, ebenso werden andere Unkosten aus den Überschüssen gedeckt. **Ein ev. sich ergebender Reingewinn nach Abzug der Unkosten, fällt den Herausgebern zu.**

Пабеларуску гэта знача:

„§ 14. Прэсавая Управа займецца даставай патрэбнай для газэты паперы. Кошты гэтага будуць пакрыты з атрымліваных лішкаў з газэты,—гэтак сама і другія выдаткі будуць пакрыты з даходаў. **Эвэнтуальна атрыманы чысты даход, адлічыўшы выдаткі, належыцца выдаўцом**“.

Лічучы патрэбным мець сваю газэту хоць-бы на найцяжэйшых варунках, беларусы, якім адпаведная прапазіцыя была зроблена ў **ультыматыўнай форме** („хочаце—добра, не—дык ніякае газэты ня будзе“), — былі прымушаны згадзіцца на яе. Тэкст канцэсыйнае ўмовы, падпісаны 2 лютага 1916 году грамадзянамі Іванам і Антонам Луцкевічамі, Вацлавам Ластоўскім (падпісываўшым спачатку газэту, як рэдактар-выдавец), загадчыкам друкарні М. Кухты, Дырсай, начальнікам Прэсавае Управы, ротмістрам Штільке і ляндштурмманам Эдм. Зуэмілем,—знаходзіцца ў Беларускім Музэі.

Літвіны на прапазіцыю нямецкае ўлады не згадзіліся, і ім канцэсіі на газэту не далі. Затое нямецкае галоўнае камандаваньне пачало выдаваць **сваю** газэту ў літоўскай мове (пад кіраўніцтвам прускіх абнямечаных літвіноў), пазбавіўшы гэтак літоўскае грамадзянства краю магчымасьці высказваць у друку свае думкі нешта, здаецца, аж на два гады...

У беларускай мове пачаў выхадзіць „Гоман“. Сябры рэдакцыі, ня гледзячы на вельмі цяжкія матэрыяльныя варункі іх усіх, **працавалі абсалютна бясплатна**. Прэсавая Управа адмовілася навет здаваць грашовую справаздачу і аддаваць чысты даход у рукі канцэсіянераў, хаця газэта разыходзілася ў ліку **3,000 экзэмпляраў і толькі за гатоў-**

Узнауленьне францускa-радавых перагавораў.

25 лютага маюць распачацца ізноў перарваныя перагаворы між Францыяй і ССРР. Паседжаньні адчыніць сам Брыян...

Бурнае паседжаньне Чэха-Славацкага Сойму.

На паседжаньні Сойму 16 лютага, на якім міністар Бэнэш меў зрабіць экспозэ ў справах заграцічнай палітыкі, узьнялася такая бура, якой яшчэ ня бачыў чэха-славацкі парлямант. Камуністы, якіх у Сойме аж 41 пасол, разам з немцамі (без сацыя-дэмакратаў) пачалі дзень вялікай дэманстрацыяй проці ўраду — за перарыў у справе прызнаньня ССРР. Паяўленьне старшыні ўраду сустрэчана было сьвістам і шумам. Бэнэшу доўга не давалі пачаць прамовы, бо дэманстранты заглушалі яе словы асобнымі сьвісткамі. У салю Сойму была ўведзена варта, што выклікала абурэньне ўсей лявіцы, крычаўшай: „Гэта ж не дэмакратыя, але паліцэйская дзяржава!“...

Павялічэньне латвійскага ваеннага флёту.

Латвійскі ваенны флёт мае быць павялічаны ў бліжэйшым часе на 2 мінаносцы і 2 падводныя лодкі. Цікава, хто дае на гэта грошы?!...

Водгук ваяўнічых прамоў Мусоліні.

Амэрыканскі Сэнат адмовіўся зацьвярдзіць умову з Італіяй у справе ваенных даўгоў, матывуючы адмову тым, што галава італьянскага ўраду пагражае выклікаць новую вайну ў Эўропе...

Дапамога безработным у Нямеччыне.

Нямецкі ўрад павялічывае дапамогі ўсім безработным—непаўналетнім на 20 прац. (на пятую частку), паўналетнім — на 10 прац. (на дзесятую частку).

Да амністыі ў Баўгарыі.

Па амністыі выпушчаны з вастрогаў 40 палітычных вязьняў, у тым ліку камуніст Кабакчэв, б. міністар ураду Стамбулійскага.

Тэрор у Грэцыі.

Як і трэба было спадзявацца, новы дыктатар Грэцыі, як і кожны іншы, распачаў сваю працу— з тэрору. Створаны новы „выняткові трыбунал“, які будзе судзіць праступленьні проці „грамадзкага ладу”... Цэлы рад асабістых працаўнікаў дыктатара Пангалёса, на чале з былым прэм. Анастасіу, высылаецца з краю...

Эўрапэізацыя Турцыі.

Ангорскі парлямант увёў у краі новы цывільны кодэкс (збор законаў), рэгулюючы жыцьцё і адносіны грамадзян, які амаль не даслоўна сьпісаны з таго, што істнуе ў Швайцарыі. Многажонства скасавана аканчальна. Кожны можа свабодна выбіраць сабе веру, якую сам захоча.

Баі ў Сірыі.

У Дамаску і яго ваколіцы пачаліся баі між паўстанцамі і францускімі войскамі. Шмат забітых і раненых з абодвух бакоў.

„Панскія забавы“—на „Крэсах“.

„Kur. Porаnny“ паведамляе аб... ці-ж можна сказаць: нячуваным?—правільней: рэдка трапляючым у прэсу — выпадку запраўднага бандыцкага нападу азброенага абшарніка на сялянскую хату— з мэтай аграбленьня...

Абшарнік-паляк Канстанты Розвадоўскі, валадар маёнтку Людвікова, Драгічынскага пав., Берасьцейскага ваяв., даведаўшыся аб тым, што сялянка Матрунка Кравец атрымала з Амэрыкі значнае адшкадаваньне за свайго забітага на вайне мужа, уварваўся разам з хурманом увечары ў яе хату ў в. Ялоча Напаўшы на Кравец, якая была адна ў хаце, і схапіўшы яе за горла, „прыраджоны валадар“-бандыт загадаў свайму хурману шукаць даляраў... Сьпярша баба, знаўшая абшарніка з твару, прымала гэта ўсё за жарты. Але хутка зразумела, што пан-бандыт душыць яе запраўды... Тады яна вырвалася з яго рук і пачала крычэць на ўвесь голас... На крык бабы зьбегліся суседзі дый скруцілі хутка абодвух бандытаў і завезьлі іх у Драгічын — на пастарунак. На пастарунку абодвух бандытаў змушаны былі закаваць у кайданы дый пасадзіць у вастрог...

Вось запраўды ж цікавая старонка з гісторыі бандытызму на нашых „Крэсах“... А сколькі падобных гісторыяў ходзіць жыўцом ад вуха да вуха, не пападаючы ў прэсу, на ўсім прасторы нашых „Крэсаў“,—аб тым ведаюць добра тутэйшыя жыхары... Сколькі даляраў адабраны больш „памысна” рознымі „бандытамі ў масках“, якія пасьля гінуць бяз сьледу, бо паліцыя... ніяк, ведаеце, ня можа іх знайсьці, ня гледзячы на ўсе стараньні...

Тая-ж газэта польскага „радыкалізму“ і польскай дэфэнзывы паведамляе аб няменш „цікавым“ выпадку—на тых жа многапакутных „Крэсах“.

Як ведама, на „Крэсах“ паны яшчэ гуляюць, ня плоцячы падаткаў... Дык вось адзін з гэткіх крэсавых абшарнікаў, багаты пан Францішак Завадзкі, спраўляў у сваім маёнтку Плішчы, гміны Пяскі, Ваўкавыскага павету, сваі імяніны. Наехала шмат гасьцей, паміж імі і — некалькі афіцэраў з ваўкавыскага гарнізону. Як чуюць сябе наагул паны афіцэры, а за іх прыкладам і жаўнеры на заваяваных „Крэсах“, як адносяцца да мясцовых „хамаў”, гэта-ж добра ўсім ведама. Дык дзяньшчыкі (ордынансы) гэтых афіцэраў паспрачаліся аб стайню з панскімі „халопамі“. Трэба думаць, што жаўнеры моцна пабілі панскую службу, ня пускаўшую іх у стайні... На бойку вышаў сам пан Завадзкі. Тлумачучы прычыны спрэчкі, адзін з жаўнераў рэзка заявіў пану-дзедзіцу, што „яны не прызнаюць нічыіх загадаў, апрача толькі афіцэрскіх“, дадаўшы яшчэ нешта мацнейшае, чаго газэта ня хоча нават надрукаваць... Пачуўшы гэта, „нэрвовы“ пан, нядоўга думаючы, — пляснуў жаўнеру ў морду... Жаўнеры пачалі крычэць... Афіцэры, абураныя расправай пана з жаўнерам, паўскаківалі з-за стала і пачалі зьбірацца дамоў. Адзін з афіцэраў на „пожэгнаньне“ крыкнуў пану, што „так можа паступіць толькі хам“... Тады „нэрвовы” пан і яму пляснуў у морду... Тады афіцэр, нядоўга думаючы, выхапіў рэвальвэр і стрэліў у пана, але папаў у яго брата, якога і палажыў трупам, раніўшы ў жывот...

Абвестка.

Управа Беларускага Каапэратыўнага Банку ў Вільні—Таварыства з аграніччанаю адказнасьцю гэтым падае да ведама **УСІХ СЯБРОЎ ТАВАРЫСТВА**, што **з 16 гэтага лютага** ў памяшчэньні Банку (Віленская вуліца № 8), згодна з § 39 статуту, Управаю вывешаны для прагляду і скантраляваньня сябрамі гадавая справаздача, балянс, а таксама рахунак прыбыляў і страт за 1925 год.

Управа Банку.

ХРОНІКА.

Канфіскацыя „Маланкі“. За нейкі „попельцовы“ жарт зусім нявіннага характару афіцыяльны абаронца „пануючае“ каталіцкае царквы ў Польшчы, камісар ураду на м. Вільню, сканфіскаваў увесь наклад № 3 беларускае гумарыстычнае часопісі „Маланка“...

Цэннае выданьне. Коштам „Беларускага Цэнтру ў Літве“ В. Ластоўскі выдаў перадрук вельмі цэннага беларускага гістарычнага памятніка пад назовам: „Лѣтописецъ Великого Кн(я)зства Литовъско(го) и Жомойтъского“ паводле сьпіску гр. Рачынскага, зьмешчанага ў XVII томе „Полнаго Собранія Русских Лѣтописей“.

Выданьне гэтае, знаёмячы шырэйшае беларускае грамадзянства з **зьместам** летапісі, якая знаходзіцца ў зборніку гр. Рачынскага і запісана ў другой палове XVI ст., — мае бясспрэчную цэннасьць. На жаль, **спосаб** выданьня значна зьмяншае **навуковую** цэннасьць памятніка: арыгінал быў пісаны славянскімі літарамі, а п. Ластоўскі (—мо з прычыны адсутнасьці гэткіх у Коўне?) перадрукаваў яго сучаснай „гражданкай“, што сьцірае шмат характэрных асаблівасьцей старое беларускае мовы і правапісу.

Літэратурны суд. Як мы паказывалі, ў мінулую суботу ў салі Віленскае Беларускае Гімназіі пад кіраўніцтвам вучыцеля беларускае літэратуры Луцкевіча адбыўся ўладжаны вучнямі старэйшых клясаў літэратурны суд над героем М. Гарэцкага з повесьці „Дзьве Душы“, Абдзіраловічам. Вінавацілі Абдзіраловіча вучаніца Забаронак і вучань Грышкевіч (VIII кл.), трэбуючы грамадзкага прысуду герою сказанае повесьці за тое, што ён не заняў выразнага становішча ў мамэнт вялікіх зьменаў на Бацькаўшчыне, ды гэтак астаўся па-за жыцьцём, як бяздзеяльны глядзельнік, змарнаваўшы на нішто свае сілы. Баранілі А. тры вучні тэй-жа VIII кл.: Шустэр, Трэпка і Радзюк, даводзячы, што А. зьяўляецца хваравітым вытварам варункаў жыцьця, якое перасадзіла яго, сына мужыцкага, на чужую яму панскую глебу ды гэтак зусім скалечыла яго духова.

Старшыня суда паставіў лаве прысяжных, зложанай з 12 вучняў VI, VII і VIII клясаў пад старшынствам вучня Артаева, гэткія тры пытаньні: 1) ці даведзена анты-грамадзкасьць паступаньня Абдзіраловіча ў адносінах да фактаў, на якіх будавала сваё абвіненьне пракуратура, 2) ці, у выпадку прызнаньня гэтых фактаў, А. меў сьвядомую, вольную і няпрымушаную волю і 3) ці дзеяльнасьць А., як беларуса і грамадзяніна, заслугуе на грамадкае засуджэньне?

Лава прысяжных, пасьля ўсебаковага разгляду матываў старон, на першы з пастаўленых пунктаў адказала: не. Гэтак адказалі і два другія, і А. быў апраўданы.

На суд сабралося шмат моладзі—вучняў старэйшых клясаў і студэнтаў. Суд выклікаў вялікае ажыўленьне сярод сабраўшыхся. Пажадаем, каб гэтыя дыскусіі ладзіліся часьцей — і ня толькі ў Вільні, бо яны вельмі дапамагаюць моладзі выпрацоўваць свой сьветапагляд і прывучаюць да крытычнага і самастойнага думаньня.

Афіцыяльны курс грошы на 23 лютага. Даляр — 7 зл. 85 гр. Залаты рубель — 4 зл. 05 грошы.

Карэспандэнцыі.

Школьнае будаўніцтва на крэсах.

(З Лідчыны).

У вёсцы Збляны, Лідзкага пав., ужо ў часе вайны ў 1914—1915 г. быў закончаны будынак для 2-х клясовай міністэрскай школы.

Дзеля нейкіх не зразумелых прычын гэты будынак улада рашыла перанясьці ў мястэчка Беліцу.

Сяляне, высілкамі якіх будавалася гэта школа, яшчэ ў леташнім годзе запратэставалі перад Міністэрствам Асьветы і мясцовымі ўладамі. Але ніякага адказу на іх пратэсты аж да гэтага часу няма.

На прошлым тыдні ад староства прыехалі тэхнікі ўжо разьбіраць гэты будынак. На дамаганьне кіраўнікоў разбору, каб сяляне далі рабочых і падводы, усе жыхары в. Збляны катэгарычна адмовіліся і на сходзе рашылі пачыніць яшчэ адпаведныя крокі, каб уратаваць з такім трудом збудаваную іхнімі рукамі для сваіх дзетак школу, дзеля чаго праз дэлегацыю зьвярнуліся да Пасольскага Клюбу Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады аб падтрыманьні іх дамаганьняў.

Зблянавец.

ку, і мела шмат платных абвестак (прыкл. аб нямецкіх дзяржаўных пазыках), дык з лішкам пакрывала выдаткі на друк і адміністрацыю. І толькі тады, як аказалася немагчымым кіраўніком газэты ня толькі запаўняць газэту, але і рабіць **карэктуру яе, што фактычна належыць да адміністрацыі**,—Прэсавая Управа згадзілася выдаваць з грошаў „Гомана“ па... 75 марак у месяц!

Грошы выдаваліся на мае рукі. 50 марак ураз-жа былі выплачываны запрошанаму за карэктара грам. Францішку Аляхновічу (квіты яго знаходзяцца ў архіве Музэю), а 25 марак ішлі на дробныя рэдакцыйныя выдаткі (паперу і інш.).

Вось запісы гэтых месячных выдач атрымалі ад сваіх тагочасных прыяцеляў-акупантаў паны Студніцкі і Обст і нясумленна ўжылі дзеля таго, каб накінуць на мяне, як на свайго палітычнага працаўніка, цень.

Тут мушу адзначыць яшчэ адзін факт, з якога відаць, што ніхто з канцэсіянераў ня толькі не атрымліваў ніякае платы за сваю працу ў газэце, *) але йшчэ мусілі **дакладаць** да выдавецтва. Умова, аб якой сказана вышэй, была падпісана, паміж іншым, і загадчыкам друкарні, у якой друкаваўся „Гоман“, а гэта затым, што абыймала і варункі друку і расцэнку аплаты складальнікаў. Вось-жа цераз два гады пасьля адкрыцьця „Гомана“ нямецкая марка значна ўпала ў цане, і складальнікі патрэбавалі вялікшае ўжо платы. Гэты дадатак і выплачывалі канцэсіянеры, а пасьля пакрывала яго Беларуская Рада, выбраная на Беларускай Канфэрэнцыі 25-27 студзеня 1918 году. У музэйным архіве можна аглядаць рахунковыя кнігі Рады, квіты і пратакольныя пастановы аб гэтым.

Так прадстаўляецца справа „кампрамітацыі“ мяне фатаграфічным зьнімкам з рахунковае кнігі Прэсавае Управы, якую няведамым мне спосабам ад немцаў дасталі паны Студніцкі і Обст, ды якую далі выкарыстаць дзеля нясумленнае мэты „казённым беларусам“...

А вось другая справа, якой „Белар. Слова“ маніцца мяне „скампрамітаваць“, ды якая **запраўды кампрамітуе ўсю „цёплую кампанію“**, за казённыя бутэрброды прадстаўляючую **„партыю беларускіх полёнофілаў“**.

Атрымаўшы ад Рады Рэспублікі ў Менску ў канцы 1918 году даручэньне паехаць на міравую канфэрэнцыю ў Парыж, я, быўшы ў Горадні (дзе пад той час была ўлада нямецкая і літоўская), пачаў рабіць крокі дзеля атрыманьня ад немцаў пропуску, каб дабрацца праз Бэрлін у Парыж. Аднак, немцы мне такога пропуску не далі. Тады, карыстаючыся тым, што літоўскім прэм'ерам пад той час быў мой асабісты прыяцель, грам. Сьляжэвіч, я зьвярнуўся да яго з прыватным пісьмом, у якім прасіў выдаць мне літоўскі заграпічны пашпарт, з якім мяне немцы **мусілі-б** прапусьціць праз сваю тэрыторыю ў Парыж. Пісьмо павёз з Горадні ў Коўну грам. Варонка, які тады быў міністрам беларускіх справаў у літоўскім урадзе. Але ўраз-жа пасьля гэтага аказалася, што маі таварышы, якія акольнай дарогай папалі ў Бэрлін, зрабілі адпаведныя крокі перад нямецкім урадам, і апошні даў загад у Горадню не рабіць ніякіх перашкод дзеля майго пераезду ў Бэрлін, дык я безадкладна выехаў туды, не дачакаўшыся навет адказу ад грам. Сьляжэвіча і, ведама, **ня ўзяўшы літоўскага пашпарту**.

Вось-жа цяпер узьнімаецца пытаньне: якім шляхам паны „казённыя беларусы“ атрымалі гэны **нявыданы** мне пашпарт з архіву ковенскага ўраду? Ці не акажацца, што „беларускія полёнофілы“ працуюць „на два фронты“ і зьяўляюцца „сваімі людзьмі“ ня толькі ў польскай, але і ў літоўскай дэфэнзыве?!...

Ант. Луцкевіч.

Вільня, 17.II.1926.

*) Гэта абгаворана і у першым пункце канцэсіі.

Са школьнага жыцьця.

(В. Лаўрыновічы, Лыскаўскае гм., Ваўкавыскага пав.).

Дзяржаўная Канстытуцыя кажа, што кожнае дзіця ў веку ад 7 да 14 год павінна абавязкова вучыцца, а той, хто ня будзе трымацца гэтага загаду, дык будзе пакараны; але ж у нас дык выйшла наадварот, бо наш вучыцель галілеец п. Кольбарчык выгнаў са школы вучня Паўла Шкодзіча. І выгнаў за тое, што вучань ня меў сшытка для арытмэтыкі, ня гледзячы на тое, што той вучань меў сшыток для каліграфіі з малымі розьніцамі ў графічных лінях, які мог быць прыдатны і да арытмэтыкі, а іншага сшытка ня было дзе купіць у гэты дзень.

Брат „пакрыўджанага“ вучня, падаў скаргу да гміннага школьнага надзору, а пан войт, сябра гэтага надзору, сказаў, што „будзе справа“, бо, акрамя гэтага, паступілі і іншыя скаргі на таго-ж самага вучыцеля.

Я назваў выгнанага вучня са школы „пакрыўджаным“, але калі ляпей разабрацца, дык можна зазначыць, што гэты вучань выіграў. Выігрнў ён тым, што брат сам узяўся вучыць яго пабеларуску — знача матчынай мовай.

Цяпер скажу, колькі слоў, аб навучаньні наагул: школа польская існуе ў нас чацьвёрты вучэбны год, але да гэтых часоў, тыя вучні, якія вучацца таксама чацьвёрты год, чытаюць па кніжцы „для другога году навукі“ дый то чытаюць так, як рак ходзіць.

Нешта ня лезе нашым дзецям у галовы польская навука!..

Эс—эс.

Каго надзяляюць зямлёю?

(В. Гудзевічы, Горадзенскага пав.).

Восеньню 1925 г. дзялілі 13 гэктараў адрэзанай ад Гудзевіцкай праваслаўнай царквы зямлі. Зямля ляжыць побач з в. Лядкі, дзе многа ёсьць малазямельных і беззямельных праваслаўных беларусаў, — і, ня гледзячы на гэта, ніводнаму з іх зямлі ня далі, але далі тром паляком: Антону Эйсьмонту і Антону Рышкевічу з аколіцы Семяшкі, у трох вярстах ад гэтае зямлі, ды Станіславу Седзяневскаму, з аколіцы Сядзеньўцы ў 5 вярстах ад зямлі, — і чацьвёртаму Максіму Халецкаму, беларусу-каталіку, які арэндаваў гэтую зямлю.

З гэтай чацьвёркі адзін толькі Рышкевіч малазямельны, а рэшта дык ня тое: напрыклад, Эйсмонт мае з братам 22 дзесяціны.

Вось, каму аддаюць нашу зямлю!..

Праваслаўны.

Дарожнае будаўніцтва на Крэсах.

(З Слонімшчыны).

У восень мінулага 1925 г. быў закончан аграмадны бэтонны мост на рэчцы на аднэй вярсьце па дарозе з Слоніма ў Дзятлава, які каштаваў ураду каля 25.000 злотых.

У студзені г. г. вада пацмыла гэты мост, і ён зусім разваліўся, так што цяпер высокія сьцены ляжаць адна на другой. Вось, як марнуюцца „драговыя падаткі“, якія са сьлязамі выплачваюцца згалелым земляробам, збываючым апошнюю карову і падушкі.

З пад Слоніма.

Які ў нас „самаўрад“.

(М. Мілейчыцы, Бельскага пав.).

Выбралі мы солтыса, Андрэя Баярскага, які добра жыве з людзьмі і добры для іх. Але войту п. Кацыку і раднаму Сц. Дзеяновічу, Язэпу Тынкевічу, Нарбуту, маці якога „графіня“ і ў добрых адносінах з бельскім старостаю,—не спадабаўся гэты солтыс, і рашылі яны пазбыцца яго.

І вось, гэная „графіня“ зрабіла патрэбнае ў старосты, скуль і прышло: звольніць солтыса з прычыны малой граматнасьці. І тут-то адбыліся цікавыя выбары. Жыхары выставілі на солтыса Янку Высоцкага, а гмінная рада—Васіля Дзеяновіча, бацька якога і цесьць—Тынкевіч—гміннымі раднымі. За Янкай Высоцкім было 36 галасоў, а за Васіля Дзеяновіча толькі—12.

Аднак-жа, зацьвердзілі ў гміне Васіля Дзеяновіча. Жыхары Мілейчыцаў паслалі пратэст у Бельскае староства. Але гэты пратэст, дзякуючы захадам гміннае рады, папаў „пад сукно“. Мілейчыцкія жыхары, будучы ў старостве, выцягнулі справу з „пад сукна“.

Але ці паможа, ці не ўцячэ яна ізноў туды-ж?

Справядлівы.

Гмінны „самаўрад“.

(Язно, Дзісенскага пав.).

Дзіўныя справы робяцца ў нас. Прыслаў нам пан староста за войта нейкага пана Лівандоўскага, кажуць бежанца з Літвы. Па абмылцы, ці што, але гэты п. войт стаў добра аднасіцца да сялян, ды стараўся быць чуць-чуць справядлівым. Вось, за гэта гмінная рада на паседжаньні сваім з 5./I. выбрала яго ўжо на стала войтам, а на заступніка старажыла нашае гміны Уладзіміра Мятлу.

Пастанову сваю паслалі на зацьверджаньне да старасты. І вось дзіва: стараста не зацьвярдзіў войтам п. Ліваньдоўскага, за адно й яго заступніка Мятлу. Апошняга мы разумеем, за што: наш чалавек ды ў дабавак мае страшнае прозьвішча, аднолькавае з прозьвішчам аднаго з нашых паслоў, нялюбага п. п. старостам.

Але чаму не зацьвердзіў п. Левандоўскага? Калі ён ня здатны, мае якія хібы, дык як мог „яснавяльможны“ староста прысылаць да нас такога чалавека за войта? А калі добры чалавек, дык чаму выкідае яго ў той час, як ён выбіраецца грамадзянамі?! Але, як кажуць людзі, справа зусім навет не ў старосьце, а ў той квадратуры, якая паўстала з паноў: Гаеўскага, Мілашэвіча, Петрушоўскага й Матусэвіча.

Гэтыя паны „зайцамі“ пралезьлі ў раду. Маюць гонар па ліку сваіх дзесяцін. Хочуць кіраваць гмінай, але так, каб гэтага ніхто й ня бачыў, дзеля чаго шукаюць халопа, які-бы слухаў іх ува ўсім.

Аднаго ўжо маюць: гэта — сэкрэтар гміны Адамчык, спэцыяліст ад „жаночых хвароб“. Лічыць сябе хвельдчарам, акушэрам і нейкім яшчэ штукаром-шаптуном. Выстаўлялі кандыдатуру нейкага пана Рыпінскага, пра якога ніхто нічога ня чуў? Ну, але тут навет і тыя дурнаватыя радныя з нашых сялян, якія заўсёды прыслужваюцца паном, не паверылі панскаму слову, кандыдатура Рыпінскага праваліласяа. 30./I. адбыліся паўторныя выбары. На гэты раз выбралі нейкага б. віцэ-губэрнатара Александроўскага Зьмітра й заступнікам таго самага Мятлу.

Пабачым, што тут зробіць пан староста са сваімі апякунамі-абшарнікамі. Ці зацьвердзіць. **Не зязюля.**

„Міласьцівы пастыр“.

(З Дзісеншчыны).

Ужо два гады як маема ў Празароках ксяндза Габшэвіча, а яшчэ ня разу не пачулі з амбоны добрага слова. Толькі і займаецца абгаворваньнем людзей, толькі і чуем, што „to nie ludzie, a bydle, rospustniki, dandyci, bolszewicy“. І ўсё гэтае адносіцца больш да беднаты, якой часьцей прыходзіцца мець дзела з гэтым прыхільным пастырам і найбольш прасіцца. Да шляхты, панкоў ксёндз мае ласку, бо ім, што пробашч запяе за шлюб ці хаўтуры — дык яны рады старацца—яшчэ плюснуць у абедзьве рукі. А мы, беднатa, вядома просімся—дык за гэтае і лічымся горшымі людзьмі. Што бярэ ксёндз з багацейшых—ня ведаем—пэўна ўжо сотнямі. Бо, калі ў сёлетнім месяцы жаніўся жыхар Празарок, Язэп Працукевіч, які ня мае — ані зямлі, ані хаты, толькі-што вярнуўся з войска, зарабляе дзе-нідзе падзёншчынай, корміць матку і брата — дык гэты „міласьцівы“ пастыр перш „назначыў“ яму 25 зл., але перад шлюбам адумаўся „зьлітаваўся“ і зажадаў 38 зл, (ведама—па курсу золата). Ня маючы ніякага выхаду бядак заплаціў зажаданую суму.

Ня дзіва, што пасьля гэткага „мазольнага“ заробку ксёндз увечары паслаў свайго закрысьціяна да „ludzi porządnych“ прасіць іх на прафэранса.

А калі часам ды наш пастыр пападзе на прафэранса да Празароцкага рэстараншчыка, дык яго апостальскі галасок чуваць далёка на вуліцы, а жыхары суседніх з рэстаранам дамоў з за гэтага галаску ня могуць заснуць да тае пары, пакуль ня скончыцца „koleżeńska прафэрка“. **Зязюля.**

Цяжкае жыцьцё селяніна-беларуса.

(Глыбоцкая гм.).

З восені 1915 г. па загаду п. Старосты і войта сяляне мусяць пільнаваць тэлефонныя слупы. На тры кілямэтры назначылі па два чалавекі, і ад 18 гадоў усе мусяць нясьці гэтую варту. Падавалі мы просьбу Старосьце, каб зьняў з нас гэты няслушны цяжар, ды нічога не памагае. А тут надарыліся маразы; бедныя сяляне вопратак ня маюць, дык, бывала, увойдзе хто ў хату пагрэцца, а не застаў паліцыянт вартаўніка хоцьбы навет перад сьвітаньнем, у 6 або 7 гадзіне, — усё роўна пратакол, і тады плаці злотых з пятнаццаць.

Зьвяртаемся з гарачай просьбай да паважаных паслоў з Сялянска-Работніцкай Грамады памагчы нам скінуць з сябе гэтае няслушнае і непасільнае для нас ярмо. **Селянін.**

Помста за дэкларацыі.

(Навагрaдчына).

У вёсцы Асташыне, Цэрынскае гміны, ад 1914 году ня было ніякае школы. На пададзеныя ў сакавіку 1925 г. школьнаму інспэктару дэкларацыі на беларускую школу—ні слуху, ні духу. Бачучы, што ўрадовае беларускае школы ня будзе, грамадзяне вёскі Асташын напісалі прыгавор на прыватную беларускую школу, у якім кандыдатам на вучыцеля і кіраўніка школы выставілі быўшага вучыцеля, грамад. Кухарчыка Юрыя з вёскі Асташын. Прыгавор і ўсе патрэбныя паперы Кухарчыкам былі аднесены ў Навагрaдак і зданы старшыне Т-ва Беларускае Школы ў Навагрaдку пану Сьвірыду Паўлу, і яны вылежваліся ў Т-ве ажно пяць тыдняў. Кухарчык за гэты час адведваў Т-ва сем разоў, але з кожным разам быў адказ — „Чакаем куратара, тады ўсё будзе ведама“. У шосты раз пан Сьвірыд сказаў, што яны ня маюць часу, бо ўвесь час ідуць суды, а ім, як адвакатам, трэба стаяць на судох. І праўда, свой клопат, а тут яшчэ нейкія школы! За сёмым разам Сьвірыд адаслаў яго да Аляксюка, віцэ-старшыні Т-ва. Але Аляксюк, відаць, ганарнейшы за Сьвірыда, бо адразу адрэзаў: „Ja jeszcze nie byłem u ministra oswiecenia publicznego, a żadnego rosporządzenia w tej sprawie nie mam“, (я яшчэ ў міністра асьветы ня быў, і ніякага распараджэньня аб гэтым ня маю)—закруціўся на адной назе і пайшоў. Кухарчык зьвярнуўся да Аляксюка пабеларуску, але той адрэзаў папольску, бо мусіць баяўся нейкіх паноў, сядзеўшых у яго кватэры, а то іх цацак на шапках. Забраўшы ў Т-ве прыгавор і ўсе паперы, Кухарчык адаслаў іх у Вільню ў Беларускую Цэнтр. Школьную Раду, а сам, купіўшы і атрымаўшы ад Бел. Цэнтр. Шк. Рады польскія і беларускія падручнікі,— з 15-га сьнежня 1925 г. пачаў вучыць, спадзяючыся атрымаць дазвол. На чацьвёртым тыдні вучэньня зьявіўся ў часе заняткаў паліцэйскі, за якім зьляцеліся амаль ня ўсе бацькі дзяцей. Але паліцэйскі толькі запісаў, з якога часу вучацца, колькі дзяцей і на якіх мовах. На другі дзень прыперлі пільны наказ зьявіцца ў пастарунак, што і было споўнена. У пастарунку напісалі пратакол і сказалі: вучыць трэба, але павінен быць дазвол і пусьцілі. Прыйшоўшы дамоў, Кухарчык ізноў пачаў заняткі з дзецьмі, але ўжо ня доўга. 7-га студзеня, у дзьве гадзіны ўночы зьявіліся да Кухарчыка два паліцэйскія і прымусілі яго падпісаць забавязаньне ня вучыць да тых пор, пакуль ня будзе дазволу ад інспэктара. 10-га студзеня 1926 г. Кухарчык папёр пехатою ў Навагрaдак да інспэктара. Але інспэктар адразу нічога не сказаў, зазначыўшы, што паведамленьне перашле поштаю. Просьбу, сьпіс дзяцей і пасьведчаньне на права вучэньня ў беларускай школе затрымаў. Пасьведчаньне выдана Бел. Цэнтр. Шк. Радай ў Вільні і цяперака знаходзіцца ў пана інспэктара. 15-га студзеня г. г. ад інспэктара была атрымана папера, у якой сказана: „Że natychmiast ma Pan zamknąć szkołę, - - w przeciwnym bowiem razie będzie Pan pociągnięty do odpowiedzialności karno-sądowej“ (ураз-жа пан мусіць зачыніць школу, бо ў праціўным выпадку пан будзе аддадзены па суд). Пасьля гэткага наказу, Кухарчык не пакіну вучыць, а, разьдзяліўшы вучняў на групы па 9 чалавек, прадаўжаў заняткі па хатах. 25-га студзеня ўночы ізноў зьявіліся паліцэйскія. Выклікаўшы на двор, паліцэйскі сказаў Кухарчыку: „Кажу вам апошні раз пакінуць вучыць, калі-ж не, то будзеце арыштаваны і тады болей ніколі не захочаце вучыць. На вас напісаны ўжо другі пратакол, а за гэтыя справы пападзеце ў катаргу. На пытаньне Кухарчыка, якая ёсьць другая справа, паліцэйскі адказаў: „будзеце ведаць за чатыры тыдні“. На запярэчаньні Кухарчыка, што 9 чалавек можна вучыць без дазволу, паліцэйскі адказаў: „можа дзе й можна, але ня там, дзе хочуць беларускай школы. Не хацелі польскай, то ня будзе ніякай, ня трэ' было падаваць дэклярацыяў, то была-б школа. З гэтым вывадам паліцэйскія пайшлі.

Хмурны.

Хцівы поп.

(В. Люшнева, Маўчадзкай вол., Слонімскага пав.).

Наш поп Бірук нядаўна высьвянціўся на папа,—раней быў інспэктарам. А дзярэ ён-жа цяпер з людцоў, аж страх. І калі пасьпеў навучыцца?

Так, у грамадзяніна Бондара радзілася дзіця — але надта слабое, дык захацелі хутчэй яго ахрысьціць. Паехалі кумы да папа і той ужо пачаў хрысьціць, аж раптам у палове і пытае: „ці грошы маеце“? А кумы кажуць, што сьпяшаліся і забыліся ўзяць. Пачуўшы гэтае, поп кінуў хрысьціць, і так дзіця і памёрла напалову ахрэшчаным.

За вянец бярэ па 40 зл., — дык некаторыя езьдзяць да ксяндза вянчацца, бо ксёндз бярэ па 15 зл.

Сваей хцівасьцяй поп адбіў прыхаджан ад царквы, — людзі ня хочуць навет і ўзірацца на гэткага „пастыра“. **Люшневец.**

Паштовая скрынка.

Браніславу Серахаму.

„Беларуская Ніва“ друкуецца толькі кірыліцай; калі хочаце мець Беларускую газэту лацінкаю, выпішце Беларускую Крыніцу.

Адрас—Вільня, Завальная вул. № 7. Бел. Кнігар.

А. Мікалайчыку.

Калі і на які час службы будуць браць 1904 г. ня ведама. Каб сказаць Вам, ці можаце карыстацца адстрочкаю—трэба павядоміць аб стане гаспадаркі і сям'і.

Ясьцы Сякрэт.

Карэспандэнцыі Вашай зьмясціць ня можам—трэба, апроч псэўдоніма, падаваць свой адрас — для ведама рэдакцыі.

Абвестка.

7 сакавіка г. 1926 году ў 10 гадзін дня ў памяшчэньні Беларускага Каапэратыўнага Банку ў Вільні—Тавар. з аграніčанай адказнасьцю (Віленская вуліца № 8) адбудзецца

Агульны сход

сяброў Таварыства з наступным парадкам дня:

1. Выбары прэзыдыуму,
2. Агульная справаздача за мінулы 1925 г., а) фінансавая справаздача (балянс) Управы Банку, б) Справаздача Наглядвае Рады аб дзеяльнасьці Банку і в) зацьверджаньне бюджэту расходаў на 1926 г.,
3. Парадак выкананьня п. 3 § 23 Статуту,
4. Давыбары сяброў Наглядвае Рады.

Наглядная Рада.

Рэдактар-Выдавец: **Ян Марцінеўскі.**

Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.